ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ

1931

ЛІПЕНЬ

№ 14



МЕНСК БУДУЕЦЦА

ЗЬМЕСТ:


ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!
ЛІПЕНЬ 1931

ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ


№ 14

АДРАС РЭДАКЦЫІ, САВЕЦКАЯ, 59
Тэл. № 11—09.

БУДУЕЦЦА ЗАВОД У МАСКВЕ
РЭВОЛЬВЭРНЫХ СТАНКОЎ
І НАПОЎАЎТАМАТАЎ
(БУДАЎНІЦТВА ПРАВОДЗІЦЬ ТРЭСТ „БУДАЎНІК")



ФОТА-ЭЦЮД **БУДУЕМ**



Апавяданьне Рыгора Мурашкі.

Малюнкі ІЗМАЙЛАВА.

Высока ўгару імкнуцца зграбныя рыштаваньні. На цэлага паўквартала абягаюць яны, бы ў клетцы, трымаючы ў сваіх крохкіх формах вялізарную істоту з каменьняў, жалеза і цэглы. Быццам стараецца яна разламаць, пакрышыць крохкія формы сваіх кайданаў, вырвацца з іх няволі і распаўсьціся на суседнія вуліцы, перарэзаць дарогу лёгкім аўто і звонкім трамваям. Але дарэмна. Як мурашкі, лёгкія, правароткія, уляпілі рыштаваньне будаўнікі—ня вырвацца. І замест таго, адзін на адзін накладваюцца паверхі, вырастае павольна прыгожы гмах. І час-ад-часу прыбываюць у сваім росьце рыштаваньні, зграбна імкнуцца ў пахмурную вышыню восеньскага шэрага неба.

На рагу, на адным з самых адказных вучасткаў работы, працуе стары муляр Рузік. З самага нізу на трэці паверх яму падносіць цэглу сын яго Стась. Уціскаецца ў плечы цяжкая „каза“, поўная звонкае цэглы; цяжка крэкчуць пад нагамі, гразёю абліплыя, сходкі. На трэцім паверсе сьлізганулася нага ў Стася і, каб не ўхапілася рука за стопку рыштаваньня, сапхнула-б цяжкая „каза“ далоў, прыдушыла-б на сьмерць.

Убачыўшы няўпраўку стары Рузік, кінуў насустрач сыну незадаволена:

— Ну што там ужо?

— Нічога.

Змоўчыў Стась, бацька і без таго нешта злуе. Часамі бяз дай прычыны, здаецца, ссунуцца на вочы сіваватыя бровы, тарганецца неяк сьмешна бруднаваты вус, выплюнецца ў вільготнае паветра гняўлівае слова. І цяпер Стась змоўчыў.

— Хутчэй ты паварочвайся,—азываецца яшчэ стары Рузік і цьвердая цэгла ў яго жылаватых сухіх руках робіцца мяккім падатным матэрыялам, з якога ён, што захоча зробіць.

— Я і паварочваюся... Не дарма ў брыгадзе...

Стары Рузік з сынам, як і ўсе рабочыя на гэтай будове працуюць на вырабатак. Мабыць затым і прыганяе сына стары муляр—цэлую зіму, бадай, давядзецца жыць бяз працы і без заработку: трыццаці чатырох рублёў страхкасы замала будзе.

Стась слухае бацькі—на ніз па цэглу ён бяжыць бегма, ня хоча гнявіць старога. Але сыходзячы на сходкі, супыняецца крыху—сьмяхотлівы голас маладое дзяўчыны-муляра гэтак падабаецца яму. Дзён пяць як прышла яна сюды, а ўжо колькі пасьпела нарабіцца ад гэтага: стары Рузік, суседкаю якому была яна, усё часьцей пачаў выкорпваць прычыны для злосьці, таксама як усё больш яго сын Стась не разумеў яго гэтае злосьці.

— Стась, ты ўсё адно як ад злосьці ўцякаеш. Не бяжы гэтак,—бачыш траха ня ўпаў з цэглаю.

Нотка руплівасьці сяброўскае чуецца ў апошніх словах дзяўчыны.

— Нічога, устаў-бы каб скінуўся,—адказвае ёй Стась, але сустракаецца вокам у вока з дзяўчынай, быццам хоча нешта большае за гэта сказаць.

І сходкі ўжо пагойдваюцца пад нагамі і Стасю ўспамінаюцца раптоўным наплывам дзяціныя гады і ясна-ясная вясна. Першыя ўсьвядомленыя ўражаньні тых гадоў залатой мітульгой рассыпаюцца перад вачыма. Багацьце фарбаў, радасьці, дзіцячага вулічнага колектыву, першыя сымпатыі і антыпатыі... Стась не заўважае як падыходзіць да сьцірты цэглы, як скідае з плеч „казу“ і пачынае нагружаць яе. І калі бярэ цяжар на плечы, тады варочаецца да свае будзёншчыны, і лёгка трыпяткі смутак прыходзіць. Але зараз-жа Стасю і радасна: на рыштаваньні дзяўчына-муляр дарыць яго ясным сяброўскім позіглядам. Тады вялікая радасьць пераплятаецца з лёгкім смуткам і наплыў нябывалай энэргіі напруджвае Стася. Ад гэтага выбухаюць агромністыя жаданьні рабіць—тварыць за пяцёха, за дзесяцёх, у адну хвіліну ўзьнесьці рэшту паверхаў на вялізны гмах і ў радасным адчуваньні свае сілы, творчай магутнасьці неперáможнасьці сказаць: „Жыві“!

Ідучы дахаты абудва маўчалі, нібы цяжкая змора задушыла ўсякае парываньне думаць. Стары Рузік ішоў павольнаю разьмеранаю хадою і Стась міжвольна выпярэджваў яго. Але паступова і машынальна стары прыбаўляў крокаў, каб не астацца ад сына і нават пачаў неўзаметку сачыць за тым, як ідзе Стась. Той ішоў маладым упэўненым крокам, і стары ніяк ня мог патрапіць ісьці з ім упоравень. Тады ставіў далей нагу і шырокім крокам параўноўваўся з Стасем.

На рагу вуліцы моцным голасам выгукваў газэтнік назву газэт. Стась прыпамянуў пры гэтым, што надоечы адбыўся тыраж аднае пазыкі. Стары Рудзік, гледзячы на Стасевы ногі, убачыў як той адышоў і ўзяў у газэтчыка сьвежы газэтны аркуш, пераламаў яго колькі разоў, схаваў разам з рукою ў кішэню, параўнаўся зноў з бацькам. За гэтым аднекуль здалёк пацяглася млявая думка.

„Вось-жа ні нашто не ўважае, робіць, што сам хоча“.

Яму і самому было невядома чаму гэтак раптам падумалася да рэчы не газэта павяла яго на гэтую думку. Нешта вось ад глыбока схаванае выштурхнула яе напаверх і стары Рузік адчуў, яе цялеснасьць. Яшчэ здалёк узялася яна і на момант перад вачыма ўстаў вобраз яго суседа па працы дзяўчыны-муляра. Зьнік. І потым мітульга асеньняй імглой заімжыла ў ваччу Вырвалася голасам.

— Усё ж ты гэтак... На свой манер ломіш.

— Што, тата?—пасьпешна спытаўся Стась і мільгом зірнуў на бацьку.

Той не пачуў нібы запытаньня. Васеньняя імгла зьнікла з воч і ўперадзе над дахам доміка, стылю і віду якога не ўявіць сабе, вырысаваліся дзікае крыжападобнае формы іржава-бляшаныя коміны. Рузікі спрадвечныя рабочыя сэзоньнікі. Продкі іхныя былі адны сталярамі, другія мулярамі, трэція каменшчыкамі. Ад дзядоў к бацьком, ад бацькоў к дзецям пераходзіць гэтая спадчына, таксама як і стары ці ня прадзеда толькі старога Рузіка на Старой Завальнай вуліцы дом. Гэта было там, дзе заўсёды заходзіла сонца і дзе ўсходу яго ня бачыў ніхто з мяшканцаў старога дому, які дахітрыліся пабудаваць некалі на два паверхі, але з якога вышла, як кажуць, ні два ні паў-

тара. Пяць бляшаных комінаў, з двума дымаадводамі кожны, высіліся над іржава-чырвоным дахам, як тыя крыжы на могілках. Апошнія часы яны ўсё часьцей ды часьцей, асабліва калі стары Рузік вяртаецца з работы, нагадваюць сабою старэнькія крыжы на могілках і міжвольна напамінаюць аб сьмерці. І сёньня, калі стары Рузік быццам прачнуўся ад сынавага запытаньня у вочы кінуліся гэтае дзікае формы крыжападобныя коміны—і ён не адказаў нічога. У душы запанавала журба, ціхі стан паднаначальнасьці чамусьці няўнікнёнаму быццам, а ўрэшце ім самім створанаму, завалодала ім. Нібы аднаўляючы старую гутарку, сказаў больш сам сабе чым сыну:

— Хай... Як сабе хоч.

Але гэтым гутарка ня скончылася. Прышоўшы ў хату, ён кінуў на покуць шапку і пахмурна павёў вокам па хаце. Усё наўкола сваім мізэрным выглядам крычала аб жыцьці, аб жалезным законе існаваньня, барацьбы за жыцьцё. Кожная дробязь, кожная латка ў падлозе, кожная пабітая і налапленая шыба, паразьвешваныя на сьценах фотографіі блізкіх дарагіх, якія даўно паўміралі—усё гаварыла аб цэлых дзесятках год жорсткага пакутнага жыцьця, змаганьня за права есьці хлеб, за права цягнуць у бясконцасьць кола Рузікаў—сэзоньнікаў, каб не зьвялося, быццам у іншым выпадку абязьлюдзела-б зямля і сьвет стаў-бы дагары нагамі.

Стась узіраўся ў газэту, узапёршыся на вакно. Бацька паглядзеў на яго—неяк сьмешна тарганууся бруднаваты вус у старога (з кухні ўваходзіла якраз старая).

— Вось-жа да гутаркі... Думаў маўчаць... ды не маўчыцца...

— Я зараз дам палуднаваць.

— Дасі яшчэ, пасьпееш... Вечна ты сьпяшаешся, а толку з таго хоць-бы на мезены кіпець. Пасьпееш на той сьвет.

— А ты вечна з сваёю злосьцю,—азвалася пакорліва старая, яна ўжо звыклася з гэтым за свой век.

— А бяз злосьці што было-б... З вамі ня злуй, дык усё дагары нагамі...

Стась адарваўся ад газэты і пачаў прыслухоўвацца да бацькавае гутаркі. Не пяршыня гэта была.

— Парадкі пайшлі...

— Чым дрэнныя,—перапыніў Стась.

— Маўчаў-бы лепей. Ды замест сваіх сходаў ды брыгад працаваць лепш стараўся, ды вучыўся рабіць... Каб майстрам стаць... Так, дрэнныя парадкі.

— Дык брыгады-ж на тое і арганізуюцца, каб лепш і больш выпрацаваць.

— Прасі грош.

Зноў тарганууся вус у старога і гэта зглядзіў Стась.

— Прасі грош з вашых брыгад—дурным людзям галовы марочыць, ды з бабамі ў подмігрі гуляць.

— Жанчына мае такія-ж правы, як і мужчына. Чаму-ж скажам жанчына ня можа быць за муляра.

— Не даждала сава адмяніць сакала.

— А вось твая суседка, што каля цябе працуе, ня горш выкладае сьцяну за старых рабочых, яшчэ нават спрытней.

У самае балючае месца патрапіў сваімі словамі Стась, у самалюбства старога, які век зьвекаваў на рабоце муляра.

— Навучыся перш... вось... брацъ у рукі цагліну... чым брацца за знаўца не ў сваёй справе. Падносчыкам вось і зьвякуеш.

Балюча было праказаць старому Рузіку гэтыя словы, бо мерыўся ён па сэнсу сказаць тое самае пэўна іначай, сказаць як бацька сыну, як бацька, які дажывае апошнія гады, а сына яшчэ ня бачыць майстрам і сваім намесьнікам. Ён сказаў гэта і сам спужаўся таго, што сказаў. Ён чакаў адказнага рэзкага слова ад сына ці ад старое, хоць і рэдка гэта чуў ад іх, ён затрывожыўся, але адказам яму быў ледзяны спакой. І стары Рузік, як тую цагліну, у сьцяну свае паказное абыякавасьці заціснуў трывогу, загладзіў цэмантам звычайнае злосьці, усерджанасьці—не паказаў знаку, што ў яго на сэрцы.

— Ты заўсёды гэтак, тата,—спакойна і нават з адцяненьнем сыноўнае пашаны загаманіў Стась.—Але-ж я ніколі не вінаваціў цябе за гэта.

Стары прамырмытаў сабе ў вусы і нецярпліва павярухнуўся, але яго зьдзівіў гэты спакойны голас сына.

— Усе вы, старыя, ня так глядзіце на новае, як маладыя, а некаторыя і да самае сьмерці ня могуць зразумець гэтага новага. Хіба-ж няпраўда?

Стары Рузік маўчаў. Ці ён адчуваў праўду сынавых слоў, ці ён думаў як адказаць, ці можа чакаў, што скажа далей сын.

— Вось, памятаеш, колькі гамонкі было некалі наконт пазыкі, ты не хацеў купляць абліґацый. Да рэчы я хачу сказаць, што я ўжо дамовіўся і мяне пераводзяць на мулярскую работу. Я не зьвякую, як ты баяўся, падносчыкам — ня ўпікай мне гэтым.

Зноў прамырмытаў нешта стары і не пазнаць было—думаў ён аскірзнуцца на гэтыя словы, пасупярэчыць яшчэ ці выказваў свае здаволеньне, сваю радасьць, калі была яна ў яго, сынам у гэты момант.

— Але я хачу даказаць пра пазыку... Ты павінен памятаць, колькі спрэчак было, да сваркі даходзіла. Ты хацеў усё сабе выгады, а не разумеў таго, што для ўсіх нас ад гэтага вялікая выгада.

— Эт...

— А цяпер—каб ты умеў чытаць ды паглядзеў у газэту...


— Мяне вучылі бацькі хлеб зарабляць, а ня грамаце.

— І дрэнна рабілі... Дык ты прачытаў-бы, што твая абліґацыя ў апошнім розыгрышы выйграла...

— Ад жылеткі рукавы.

— Дваццаць пяць тысяч рублёў.

Яшчэ ніколі гэтак ня дрыжэлі рукі ў старога Рузіка ні ад радасьці, якое мала даводзілася бачыць яму на сваім жыцьці, ні ад страху, які цесна пераплятаўся з горам, ад страху страціць правы на кавалак хлеба. Гэты выпадак не межаваў з радасьцю як не межаваў і з горам. Гэта было надзвычайнае сілы вяліз-



...І таксама павольна сышоў далоў...

нае ўзрушэньне, якога ня мог спакойна перажыць стары Рузік. Гэта было большае за радасьць і страх, а можа ў ім адным якраз злучалася і тое і тое: радасьць знойдзенага і страх, каб ня ўтраціць. З гарачкі ён пайшоў яшчэ з ранку на працу, але ня вытрымаў. Цагліны клаліся ня роўна, коса, гарбацілася роўная лінія кладкі.

Усё гэта відаць ад таго, што рукі дрыжаць*, падумалася раптам—і перад вачыма паскакалі зоркі адна за аднэй, скружаючыся, затуманьваючы ўсю будову, рабочых, цэглу, сьцяну. Ён пахіснуўся і ўхапіўся інстыктыўна за стойку рыштаваньня.

— Абмарачыўся, стары?—гукнуў рупліва-весела яго сусед справа, але стары Рузік пачуў як праз сон і зусім ня ў змозе быў адказаць.

Не сказаў ён нічога і на тое, што дзяўчына-муляр рупліва ўзяла яго пад руку і павяла да сходаў уніз. На паўдарозе толькі, калі пасьвятлела ў ваччу, ён угледзеў хто яго вядзе, але ня выказаў ніякага абурэньня, ні гневу, а толькі ціха, абыякава сказаў:

— Ня трэба.

І паволі выслабаніў сваю руку з-пад яе рукі і таксама павольна сышоў далоў. Дахаты ішоў адзін, не пабачыўшы Стася, сын працаваў ужо мулярам на другім вуч стку будовы.

Перад самым домам яго пацягло завярнуцца і пайсьці назад, але ў вочы кінуліся крыжападобныя каміны над дахам, а рука заціснула ў кішэні пачкі навенькіх пяцідзесяцірублёвых чырвонцаў і падумалася:

„Трэба перарабіць будзе, цагляныя павыводзіць... Ад гэтых лёгка пажару зрабіцца.

І ўспамянуў, як некалі з стрыечным братам—бляхаром, што жыў у гэтым самым доме, рабілі гэтыя каміны, як здавалі верхні паўпаверх на кватэру. О, досыць, перарабіць і спакойна дажываць старасьці.

З гэтага дню стары муляр Рузік не пайшоў на работу. Некаторы час адчувалася, што яму не стае нечага, што перарвалася нітка яго будзённага жыцьця і, нявылазна седзячы дома, дзівіўся, як гэта людзі могуць жыць так. Пры гэтым ён пазіраў на свае кастравыя, патрэсканыя рукі, на вузлаватыя пальцы, на далоні, у якія паўядаўся пыл цэглы і цэмант. І ня мог выседзець без работы.

Праз некалькі яшчэ дзён стары Рузік дастаў цэглы. А ўвечары, калі прышоў з работы Стась, сказаў жонцы, каб не паліла заўтра ў печы, трэба перарабляць каміны.


— І кватарантам скажы. Братавай я ўжо казаў.

— Ты, тата, грошы можа ў ашчадкасу на кніжку занёс? А калі не, дык трэба было занесьці,—сказаў Стась.

— Дык-жа бацька,—дадала старая,—чаго добрага... З грашыма трэба сьцерагчыся.

— Нічога ім ня зробіцца. А ў касу—хадзі ды прасі пасьля, як нейкае ласкі, свае грошы. Штодня прыдзецца браць пакрысе. Вось ,хату трэба перарабіць трохі а то як у чужой сядзіш.

— А ўжо заўсёголаў,—азвалася старая.—Пражылі век у такой, дабудзем і сьмерці, старыя. Вось хіба Стасю... Як ажэніцца... Ды пачнуцца дзеці...



...Стась узіраўся ў газэту, узапёршыся на вакно...

— Гэта мабыць яшчэ ня хутка будзе,—весела адказаў Стась.

Стары маўчаў. З таго дня, як пакінуў хадзіць на работу, ён больш ні разу не ўспамінаў пра тое, што Рузікі павінны пладзіцца і цягнуць у бясконцасьць сваё існаваньне. Апошнія падзеі зрабілі яго больш маўклівым, з закрытай для, яго блізкіх душой і невядомымі думкамі.

— А калі думаеце дзеля гэтага хату папраўляць, дык яно можа і ня варта. Я спадзяюся, што мне знойдзецца кватэра ў адным з тых дамоў, якія я будаваў і будаваць яшчэ буду.

— Набудаваў...

Таргануўся бялоча сівы вус старога Рузіка, не сказаў больш ні слова, устаў і моўчкі вышаў з хаты. Ці не патухла ў яго старой упартай галаве вытадаваная за ўсё жыцьцё, перададаная яму бацькамі і дзядамі, думка аб неабходнасьці цягнуць у вечнасьць патомства Рузікаў, пладзіць і множыцца... Сапраўды ці гэтак ужо неабходна яно. А моцвясёлы, з крыхою жартлівасьці голас сына яму ня зусім упадабаў. Ні жонка, ні сын не маглі адгадаць гэтага; стары Рузік замкнуўся моцна з сваімі патайнымі думкамі сам-на-сам.

Пра здарэньне з бацькам на рыштаваньнях Стасю сказала неяк дні праз два дзяўчына-муляр. Стася крыху ўстрывожыла пачутае, крыху, бо ідучы поруч з ёю, маладою, поўнаю сілы, жыцьця, гэтак не хацелася ўдавацца ў трывогу і сум.

„Папытаю прышоўшы“, падумаў.

Але прышоўшы і ўбачыўшы абгароджанага з усіх бакоў маўчанкаю бацьку гэтак нічога і не папытаў. А што пытацца,—нават таго дня, як здарылася гэта, ён нічога ані не заўважыў на бацьку. Нічога ня ведала і старая. Гэтак і прайшло.

Гэтага дня клаліся спаць усе кожны са сваімі, рознымі ад іншых, недавыказанымі думкамі. І ўставалі таксама. І таму Стасю хацелася хутчэй пакінуць хату, каб уліцца ў бадзёры струмень змаганьня з цэглаю, цэмантам, жалезам, дрэвам, каб высока пад самыя воблакі ўзьнесьці горды мур рабочых кватэр. Хацелася далёка за сабою пакінуць гэтую хатнюю, старую, як сям'я, нэндзу недавыказанасьці, маўчанку. Хацелася крыкнуць на ўвесь голас і парыўчата, бяз спрэчкі з самім сабой, кінуцца ў бой за жыцьцё, аддаць сваю непазбыўную радасную энэргію, нечалавечыя сілы, якія вытрымаюць у ра учай байцы.

Прыгожы восенскі дзень канаў у золаце захаду, калі Стась, поўны нявыказных радасных парываньняў вяртаўся з работы дадому. Нібы ненарокам ішла з ім дзяўчына-муляр і ад гэтага было яшчэ радасьней. Ён расказаў пра ўчарашнюю гутарку з бацькамі, а дзяўчынка сур'ёзна, але з трыпятаньнем у сэрцы слухала. Абаім было радасна.

— А ведаеш,—сказаў Стась, паказваючы на крыжападобныя каміны над дахам бацькавага дому. Паказаў і зьдзівіўся: замест пяці камінаў высіліся толькі тры, а на даху ляжала сажа, кавалкі цэглы, бляхі.—Такі бацька пачаў перарабляць каміны, вось упарты. Што ім, старым... А я, ведаеш, думаю, што хутка гэты бацькаў палац пойдзе на злом і мы тут паставім сапраўды новы палац...

— Для новых людзей,—дадала дзяўчына і разьвіталася сяброўскім поціскам рукі.

Дома Стася сустрэла жалоба. Галасіла і праказвала маці. І сьлёзы ўжо больш ня ішлі здаецца, а яна ўсё выцірала глыбока запалыя вочы хвартухом і падпірала зморшчаную бараду сухою далонькю.Вусны яе сухія пакутныя трымцелі нясутрымна ад глыбокага сардэчнага жалю.

— А ўжо засталося і мне,—пакорліва галосным шэптаменкам вырвалася з яе набалелых грудзей.

Памёр стары Рузік. Нечакана, сама распачаўшы працу над хатаю. Не дапамагла яму ні мэдыцынская дапамога, якую прывёз хуткі аўтомобіль. ні гора і каханьне блізкага сябра—старое жонкі, якая прайшла ўпоравень з ім увесь доўгі калючы шлях жыцьця. Разарваўся маятнік чалавечага організму і машына сказала:

„Годзе! Я сваё адпрацавала. Хай на маё месца стане новая, лепшай конструкцыі, новай конструкцыі машына“.

Пахучай вясновай раніцай на даху пяціпаверхавага белага гордага муру ён густа вырысоўваўся на сінім фоне вясны. Белавата-шэры комін, у які ён укладаў свае маладыя мулярскія здольнасьці, адсьвечваў на яго твары—і белае з сінім гэтак выгодна і трапна вылучалі яго постаць на даху новага гордага муру. Асабліва выразнай робіцца яна тады, калі праз вакенца, што вядзе на дах, з цяжкім вядром цэманту ў аднэй руцэ выходзіць стройная дзяўчына-работніца і паставіўшы вядро каля яго прыпыняецца на хвіліну. У гэтым спалучэньні на далёкай вышыні, на сінім фоне вясны такая прыгожасьць. Нават галасы чутны. Нават чутно як лапаціць бляха пад нагамі і як мулярскі скрабок шархаціць па коміне. Постаць дзяўчыны хаваецца ў вакне пад дахам і бела ата-шэры комін застанаўляе сабою муляра. Сіні фон вясны, пахучая празрыстая раніца над дахам гордага муру і маладу муляр з дзяўчынай, ад якіх нясе вясной і зграбнай дужасьцю.


ЛЕС ІДЗЕ

ФОТА КОШАЛЕВА


ЛЕСАСПЛАЎ ПА РАЦЭ БЯРЭЗІНА



Пасы, якія прыбываюць з выплаўкі да фарміровачнага пункту.



Выгрузка дроу з баржы.




Нарыхтоўка дрэвасіны ў возеры для транзітнага сплаву.



Выгрузка стойкі з баржы на перавозачным пункце для кагрузкі ў вагоны і адпраўкі ў Донбас.



Гатовая транзітная адз нка да сплаву.



Прыбыўшыя пасы для перафарміраваньня ў транзітныя адзінкі.

Здарэньне на Маршалкоўскай вуліцы

Апавяданьне АНАТОЛІЯ ВОЛЬНАГА.

Малюнкі ДАВІДОВІЧА

I.

Раўнадушныя белыя каменіцы Вільні і высокае сіняе неба здавалася дзівіліся на гэтых настарожаных, сьмяртэльна варожых друг другу людзей.

У сярэдзіне Ігната Рабцава нешта абарвалася, але ён сабраў волю і надворна спакойным тонам сказаў:

— Здароў Куніцкі!

Далей Ігнат Рабцаў ня ведаў што гаварыць і насьцеражыўся, чакаючы, што будзе рабіць Куніцкі.

Па вуліцы па справах і бяз справы шпацыравалі людзі, афіцэры, шпікі і паліцэйскія.

Ігнат Рабцаў ведаў, што перад ім стаіць провокатар, які ўжо не адзін дзесятак членаў компартыі Заходняе Беларусі аддаў дэфэнзыве.

У сваю чаргу і Куніцкі падазрона ўпіўся вачыма ў Рабцава, стараючыся зразумець, ці ведае ён яго ролю ў партыі ці не.

Тымчасам Рабцаў пасьля першай неспадзяванкі прышоў у і сябе вырашыў перайсьці ў наступ:

— Я цябе даўно шукаў Куніцкі...—сказаў Рабцаў.

Куніцкі ўсё яшчэ пранізваў вачыма Рабцава, але адчуваючы што ён знаходзіцца ў цэнтры гораду, што на яго баку ўсё: шпікі, афіцэры і паліцэйскія, рашыў не сьпяшацца.

— Я цябе таксама хацеў пабачыць...—працэдзіў Куніцкі. Мне трэба пагаварыць з табою па вельмі пільных партыйных справах...—усё болей аўладаючы сабою гаварыў Рабцаў. Толькі тут вельмі людна...—дадаў ён, каб адцягнуць час.—Аб якіх справах гаварыць з гэтай поганьню?—напружана думаў Рабцаў.

... Па важных партыйных справах? — меркаваў у той час Куніцкі...—Адно з двух: ці ён мяне місьціфіцыруе, ці ён набіты дурань.

Але Рабцаў, здавалася, і не ўяўляў з кім ён гаворыць і таму надворна спакойным тонам Куніцкі адказаў:

— Зьвернем за рог, там меней народу. Зручней пагаварыць будзе.

Рабцаў спакайней уздыхнуў.

Некалькі хвілін передышкі было ў яго распараджэньні і за гэтыя некалькі хвілін трэба было або знайсьці выхад, або сесьці ў дэфэнзыву.

Прайшлі некалькі крокаў.

— Вось, што—сказаў Рабцаў азіраючыся, каб зрабіць выгляд што ён баіцца, каб іх не падслухаў які шпэк,—у апошнія часы ў нашай організацыі адбыліся шматлікія арышты.

Куніцкі падазрона ўскінуў вочы на Рабцава, але твар таго быў спакойны і непранікнёны.



...Калі ты падрасьцеш, ты дапаможаш мне...


— Так... чуў.—Адказаў Куніцкі, напружана думаючы аб тым, да чаго вядзе гутарку Рабцаў.

— Многа адказьнейшых працаўнікоў арыштавана! — спакойна, узьвешваючы кожнае слова і пільна ўглядаючыся ў Куніцкага, гаварыў Рабцаў.

Куніцкі паправіў гальштук і неўзнарок локцем абмацаў браўнінг, што ляжаў у бакавой кішэні яго паліто.

Прайшлі некалькі крокаў моўчкі ў лютай нянавісьці адзін да аднаго.

— У сувязі з гэтымі і арыштамі я мяркую даручыць табе адну вельмі адказную працу, бо нестае надзейных людзей.



— Прыкідваецца ці сур'ёзна?—думаў Куніцкі, углядаючыся ў твар Рабцава.

— Я хацеў-бы, каб ты ўзяў на гэты час на сябе клопаты аб нашай консьпіратыўнай кватэры.

У Куніцкага моцна забілася сэрца і міжвольна лёгкая фарба заліла яго шчокі.

Консьпіратыўная кватэра! Клубок самага патаемнага ў руках Куніцкага! Няўжо не здагадваецца?—радасна прабеглі думкі ў галаве Куніцкага.

— Я пайду туды, куды мяне пашле організацыя!—ледзь стрымліваючы радасьць,—адказаў Куніцкі.

— Я так і думаў, што ты згодзішся,—прашаптаў Рабцаў.

— А што, калі ён аба ўсіх маіх намерах здагадваецца і мне сьціфіцыруе мяне?—зноў прамільгнула думка ў галаве Куніцкага. І халодны струмень сьціснуў яго сэрца і ў вачох яго блiснулі злыя агенчыкі.

— Ну дык лічым пытаньне вырашаным і заўтра-ж спаткаемся з табою для таго, каб я змог табе паказаць консьпіратыўную кватэру, бо сёньня ў мяне няма вольнай хвіліны.

Зноў думкі, перасякаючы адна адну, спляліся ў галаве Куніцкага. Пропозыцыя прывабная! Бліскучая кар'ера чакае Куніцкага! Толькі ці праўдзіва тое, што гаворыць Рабцаў?

— На якой вуліцы заўтра спаткаемся? — перабіў думкі Куніцкага Рабцаў.

Крыху падумаўшы, Куніцкі назваў вуліцу Міцкевіча.

— Ты-ж ведаеш, што на такіх людных вуліцах мы ніколі ня робім спатканьняў.

Куніцкі, крыху прыжмурыўшыся, глянуў на Рабцава,—ці не выбірае глухую вуліцу падумаў ён і ўспомніў пра сьмерць у розных падваротнях Вільні провокатараў, — сваіх колег па профэсіі.

— Выберы другую вуліцу, менш людную,—спакойна прапанаваў Рабцаў, але твар яго быў такі шчыры, што Куніцкі супакоіўся і, паразважыўшы, назваў Маршалкоўскую вуліцу, праўда, ня менш людную, чым Міцкевіча.

— Ну, добра... А шостай гадзіне заўтра на Маршалкоўскай вуліцы... Без спазьненьня...

— Адну хвіліну...—супыніў Куніцкі Рабцава.—У мяне вось,— і ён дастаў з кішэні пачку сьвежых, толькі што атрыманых з дэфэнзывы грошай,—у мяне вось мопраўскія грошы і я хачу зараз табе іх перадаць.

— Пасьпееца,—наскрозь зразумеў яго няхітры ход Рабцаў. Заўтра перадасі. Ітак, да заўтра!

Значыць усур'ёз думае заўтра спаткацца рашыў Куніцкі і спакойна пайшоў у другі бок.

Якая кар'ера, якая блускучая кар'ера!

II.

— Разумееш? Твар да твару спаткаў Куніцкага... Ведаеш таго балахоўца-провокатара, што пад выглядам рабочага пралез у партыю...—гаварыў у хаце сваёй жонцы Рабцаў,—Думаў, што ўжо не вярнуся ў хату...

Алесь, пяцёхгадовы сын Рабцава, які ў куту пакою вазіўся з нейкімі кубікамі, не ўдаваў і віду, што чуе гэтую гутарку, бо часта, калі ён пачынаў прыслухоўвацца, гутарка быццам неўзнарок спынялася.

Але Алесь чуў гэтыя словы, як і многія іншыя, і пра сябе думаў:

— Балаховец!—гэта вельмі дрэнна, калі з ім спаткацца.

Жонка Ігната Рабцава,—маці Алеся, яшчэ маладая кабета, але на яе твары ўжо адбілася маршчынамі тая напружаная заклапочанасьць, у якой ёй прыходзілася жыць гэтыя гады.

— Алесь! Ідзі сюды!—уголас сказаў бацька, зьвярнуўшыся да сына.

Алесь хацеў было ўскочыць і кінуцца да бацькі, якога ён нязвычайна любіў, але консьпірацыя, у якой жыла гэта кватэра, яму напамінала нейкую вельмі дзіўную гульню дарослых і ён, падражаючы дарослым, прывучаўся консьпіраваць свае пачуцьці.

— Зараз,—адказаў ён,—я заняты!

Потым, не сьпяшаючыся, Алесь падышоў да бацькі.

— Алесь!—ласкава зьвярнуўся бацька да сына. — Калі ты падрасьцеш, ты мне дапаможаш?.. — бацька абняў сына, пасадзіў да сябе на калені і, правеўшы рукою па яго белакурай грыўцы, перапытаў,—Дапаможаш?

Ці дапаможа Алесь бацьку?.. Радасьць і горласьць перапоўніла маленькае сэрца Алеся і ён ледзь не заплакаў ад любові і дзіцячай адданасьці бацьку, але нешта ўспомніўшы стаў сур'ёзным і падражаючы бацьку пастараўся зморшчыць лоб і як мага мацней сьціснуць бровы.

— Дапамагу!—грубым, як у дзядзі Васіля, што да іх заходзіў, голасам адказаў Алесь.

... І ўжо змрок атуліў зямлю, і тысячагадовы месяц паплыў скрозь хмаркі сваім старым шляхам і ўсё яшчэ гутарылі і радзіліся паміж сабою бацька і дзіця, якое так мала бачыла дзяцінства.

III.

На другі дзень роўна а шостай на ўмоўленым месцы зьявіўся Куніцкі.

Кар'ера сама ішла яму ў рукі і пэрвова бадзёрая радасьць прымушала нецярпліва біцца яго сэрца.

Ён прайшоўся па вуліцы, падазрона ўглядаючыся ў сустрэчных. Бач, у дэфэнзыве турбаваліся, што гэта былі хітрыкі Рабцава, каб уцячы ад Куніцкага..

Але ад Куніцкага ня так лёгка ўцячы!

Куніцкі глянуў на гадзіньнік.

Было пяць хвілін на сёмую.

Зараз зьявіцца! рашыў Куніцкі, цярпліва ходзячы па тротуары. Ад яго, ад Куніцкага, ня так лёгка ўцячы!..

Праходзілі хвіліны, уздымаючы напруджанасьць Куніцкага.

— Няўжо сапраўды гэта былі хітрыкі Рабцава? — прарэзала галаву думка і болем сьціснула сэрца провокатара.

— Не, ня можа быць... Ён прыйдзе, — ён павінен прыйсьці... ледзь не маліўся Куніцкі.

За жыцьцё Рабцава, ён, Куніцкі атрымае ўзнагароду. І Куніцкі бачыў сябе ў ордэнах і нашыўках...

Праходзілі хвіліны... але таго, ад каго залежала кар'ера Куніцкага, ня было. Чалавек у ордэнах закруціўся ў вачох Куніцкага і як міраж зьнік, пакінуўшы на тротуары разгубленага, абуранага агента дэфэнзывы.

Дзесяць, пятнаццаць хвілін на сёмую.

Куніцкі адчуваў як б'ецца яго сэрца.

— Жулік, рабаўнік, нясумленны бандыт! — падшукваў Куніцкі словы для таго, каб вызначыць імі ўчынак Рабцава.

Павольна беглі хвіліны.

Куніцкі прайшоў па вуліцы яшчэ раз і, азірнуўшыся, зьвярнуў за рог.

Тут-жа да яго падскочылі два джэнтльмэны. З-пад двух кацялкоў джэнтльмэнаў, замест твараў, глядзелі два запытальнікі.

— Панове... ня ведаю, штоб гэта магло значыць... Ён заўсёды быў такім акуратным... Панове,—ня ведаю, што мне цяпер сказаць начальніку...

Кацялкі ўсьміхнуліся і адзін з іх сказаў, ледзь стрымліваючы пагардлівую ўсьмешку:

— Скажэце, што вы дрэнны агент дэфэнзывы...

— Так... Пан Куніцкі апынуўся, няхай пан прабачыць, — у дурнях...—пацьвердзіў другі кацялок...

— Няхай паны крыху пачакаюць са сваімі меркаваньнямі!.. пахмурна сказаў Куніцкі...—Я яго ўсёроўна, ці жывым ці мёртвым,—дастаўлю дэфэнзыве...

IV.

Куніцкі дзень і ноч шныраў па вуліцы, пляцох, завулках... Куніцкі ўглядаўся ў сустрэчных, даганяў тых, хто ішоў сьпераду.

Ён круціўся, як ашалелы, ішоў, выцягнуўшы галаву, як лягавы, гатовы кожную хвіліну зрабіць стойку. І тады, калі ён ужо выбіваўся з ног, калі ён ужо рашаў, што Рабцаў згінуў бясьсьледна — Куніцкаму пашчасьціла. Зноў нечакана для іх абодвых яны спаткаліся тварам да твару.

— Трымайце яго, — гэта самы люты бальшавік! — крыкнуў нэрвова гістэрычным крыкам Куніцкі.

У хвіліну натоўп, цікавы да ўсякіх здарэньняў, абкружыў Рабцава.

Падбеглі паліцэйскія, афіцэры, шпікі. Паліцэйскія, убачыўшы перад сабою надворна зусім спакойны твар Рабцава, замяліся.

— Гэта вар'ят! Зусім спакойна, амаль бязудзельным голасам сказаў Рабцаў. Я першы раз у жыцьці бачу гэтага няшчаснага... Вось мае дакуманты і праверце з якога вар'яцкага дому ўцёк гэты пан.

— Панове! Я свае дакуманты пакажу толькі ў дэфэнзыве..

Паліцэйскія пераглянуліся, потым адзін з іх сказаў:

— Няхай пан будзе ласкаў прайсьці з намі ў дэфэнзыву...

— Але ў мяне няма часу!..

— Але пан адразу-ж выйдзе з дэфэнзывы!

Нехта крыкнуў рамізьніка, Рабцава і Куніцкага ўсадзілі і павезьлі ў дэфэнзыву.

Рабцаў узважываў кожнае сваё слова, якое ен скажа ў дэфэнзыве, спадзяючыся да апошняга.

Нарэшце дзьверы дэфэнзывы адчыніліся.

— А... Мы пана шукаем, шукаем, а пан сам да нас прыехаў...— радасна млосным голасам ускрыкнулі два кацялкі, накіроўваючыся да Рабцава.

V.

Ігната Рабцава, — бацьку Алеся, засудзілі на шмат гадоў цяжкога „вязьненьня".

Калі бацька выйдзе з катаргі, сын будзе ўжо дарослым.

І калі Алесь першы раз пачуў аб гэтым, з вачэй Алеся на заўсёды зьбегла дзіцячая радасьць і Алесь пакляўся:

— Я дапамагу табе, бацька!..

— Толькі хутчэй падрастай! — гледзячы вачмі, поўнымі любові і журбы, адказала маці.

... І кожны дзень, кладучыся з вечара ў ложак, Алесь чакае, што ён заўтра прачнецца дарослым.

І кожную раніцу, прачнуўшыся, Алесь шкадуе, што ён яшчэ дзіцянё...

Але прыйдзе некалі адзін такі дзень, і ў гэты дзень Алесь прачнецца дарослым.

І Алесь тады дапаможа бацьку!..

І гэта нямінуча і супроць гэтага бясьсільны ўсе кацялкі дэфэнзывы,—як бясьсільны яны супроць ходу гісторыі.



...—Трымайце яго,—гэта самы люты бальшавік...

НА РЫШТАВАНЬНЯХ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАУНІЦТВА

НОВЫ МЕНСК ПЕРАТВАРАЕ БЫЛУЮ ЗАХАР'ЕЎСКУЮ Ў САПРАЎДЫ


САВЕЦКУЮ ВУЛІЦУ

Фота здымкі САЛАВЕЙЧЫКА.









У КРАІНЕ ЦУДАЎ НА ВІСЬЛЕ

Нарыс Л. КЛІМЧУКА.

Быў цудатворны час. Шмат хто рабіў і цуды паказваў. Такі час быў.

Паказвалі цуды: папы ў царкве, цыркачы ў цырку, махляры на рынку. Жыцьцё-ж зьмяняецца, зьмяняюцца маштабы, зьмяніліся і рамкі і маштабы рознага роду цудаў.

Мы ўсе помнім героічны паход савецкіх лёдаколаў „Красіна“ і „Малыгіна“ на паўночны полюс у Аркцыку, мы ўсе помнім проста баячныя палёты Чухноўскага і Бабушкіна, якія, рызыкуючы сваім уласным жыцьцём, паляцелі ратаваць і выратавалі пацярпеўшы аварыю экіпаж дырыжаблю „Італія“. І вось калі фашыцкі генэрал, авантурыст Умбэрто Нобіле апынуўся ва ўтульнай каюце карабля „Горада Мілана“, ён заспакоіў прысутных адносна лёсу лейтэнанта Вільера і астатніх пакінутых храбрым генэралам на лёдзе.

— Яны не загінуць,—запэўняў Нобіле,—з імі-ж захаваўся цудатворны абраз Мадоны дзі-Лёрэта!

Нічога ня зробіш. Абраз Мадоны дзі-Лёрэта з дапамогаю савецкіх лёдаколаў і лётнікаў як-небудзь ужо выратаваў пагібаючых. Цуд! Вы цяпер ужо можаце верыць у цуды!

Бывалі і не такія цуды. Цуды здараліся ня толькі з асобамі, а цэлымі дывізіямі, нават арміямі. „Прыехаў Кутузаў біць французаў“. Справа на Бярозе была. Мясцовасьць да нас блізкая. Палякі, французы, немцы ня раз тут галовы ламалі. І вось Кутузаў б'е Наполеона і ў якасьці кіраўніка ў кожную расійскую армію дадаюцца цудатворныя абразы. Са Смаленску Вязьмы, Турава і іншых цэркваў заклікаюцца абразы на дапамогу расійцам. І вось уявеце сабе, а ня толькі французскую армію, але і самога Наполеона рыхтуецца Кутузаў заналоніць. І чаму не?! Адступаючы да Бярозы Наполеон меў усяго 35000 войска. З фронту ля Барысава яму шлях загароджвала саракатысячная армія расійскага генэрала Чыгачова, з поўначы, ля мястэчку Халопенічы, 35000 армія Вітгенштэйна, а на шляху ад Талачына на Воршу—знаходзіліся 60000 войска Кутузава. А ў кожнай арміі цудатворныя абразы, як тут ня ўзяць Наполеона?

А здарылася зусім так, што Наполеон правеў усё войска сваё праз Бярозу не пачуўшы аніводнага стрэлу з боку расійцаў. А цудатворныя абразы. Яны ў гэты час шукалі Наполеона. Ну і не знайшлі. Бывае.

У больш блізкія да нас часы, у 1920 годы, у часе окупацыі белапалякамі гор. Барысаву, 3 мая, у дзень польскай „конституцыі, быў наладжаны вайсковы парад. Амаль уся другая дывізія легіёнаў удзельнічала ў гэтым парадзе. Парад, зразумела, без набажэнства не абыходзіцца. У Барысаве на плошчы стаіць царква. Касьцёл за пару кварталаў. Прышлося аж з касьцёлу цягаць на плошчу ўсе абразы, паставіць на спэцыяльна пабудаваны памост, які,—о, божа,—ня вытрымаў цяжару абразоў, перакуліўся і разам з сабой пацягнуў абразы.

У той вечар другая дывізія легіёнаў пайшла ў наступ на Воршу, на Маскву і... заўтра ўвечары расхістанымі і разьбітымі прыляцелі назад у Барысаў.

Пад ст. Прыяміна напаткалі на бальшавіцкі панцырнік, які кулямётным і гарматным агнём разагнаў нашую дывізію. А апрача таго... яшчэ ўчора відаць было, што разаб'юць нас.. бачылі як абразы... падалі...

Чырвонаармейскія кулямёты—і падаючыя абразы. Як затуманіць трэба салдацкую сьвядомасьць, каб прывучыць яго да сілы абразоў! Які ўзровень камандаваньня!

Пілсудзкі, які ў сваёй кніжцы „1920 год“ імкнецца давесьці, што ён уласна „творца“ цудаў, што гэта ён сваёй цудатворнай сілай рабіў „цуды на Вісьле“, ня ўспамінае пра ўдзел маткі боскай Чэнстахоўскай у гэтай опэрацыі. І сапраўды, навошта дзяліць з кім-небудзь гонар перамогі. Польскі фашызм ужо зрабіў Пілсудзкага ледзь ня богам. Комэндант, ён-жа начальнік дзяржавы, ён-жа вярхоўны судзьдзя, ён-жа цудатворца і сам бог.

Так, што, як бачыце, цуды розныя бываюць! І быў там цуд, што экономічны крызіс расхістаў увесь капіталістычны сьвет, у тым ліку і Польшчу цудатворцы Пілсудзкага. А катастрофа павялічылася асабліва таму, што пацярпеўшыя катастрофу капіталісты ўсяго сьвету адмовіліся даваць больш Польшчы грошы і тады спыніліся цуды. Не памагае больш Пілсудзкі, не памагае і тэрмінова выкліканая на дапамогу матка боска Чэнстахоўска. Пасьля адзінаццаці год з часу вісьленскіх цудаў, Польшча дайшла да гэткага становішча, што сам Пілсудзкі ня хоча нават удзельнічаць у ратаваньні.

— Навошта компромэтаваць сябе гэткай няўдзячнай работай?

Экономічная разруха ў Польшчы дасягнула вялізарных памераў. Звыш 1500 фабрык і заводаў бяздзейнічаюць. Спыніліся буйнейшыя прадпрыемствы, якія перанесьлі экономічную разруху часоў нямецкай окупацыі і цяжкога крызісу 1926 году. Краіна перажывае глыбокі аграрны крызіс, які з асаблівай сілай б'е па ўсёй народнай гаспадарцы з прычыны пераважна аграрнага характару краіны. Польшча знаходзіцца пад пагрозай фінансавай катастрофы. Урад ужывае выключныя захады для выратаваньне сябе ад фінансавага краху, скарачаючы расходы ўсіх міністэрстваў, апрача вайсковага і паліцыі. Для заспакаеньня чыноўнікаў і інвалідаў, якім амаль на сорак процантаў скарочана пэнсія, урад распаўсюджвае чуткі, што скарачэньне пэнсіі датычацца таксама афіцэрскага і унтэрофіцэрскага корпуса.

Ужо высьветлілася, што бюджэт будзе выкананы толькі напалову, замест двух, толькі адзін мільярд злотых. Але і гэтая лічба пакуль-што проблематычная, бо краіна настолькі абяднела, пакупная здольнасьць насельніцтва нагэтулькі зьменшылася, што наўрад ці ўдасца выгнаць і гэты бюджэт.

А між тым са ўсяе краіны паступаюць вельмі непакойныя весткі. Ва ўсіх прамысловых цэнтрах адбываюцца дэмонстрацыі і забастоўкі, а таксама лютыя сутычкі з паліцыяй.

У Барыслаўлі (нафтавы раён) непарадкі адбываліся на працягу некалькіх дзён. Беспрацоўныя спынялі фурманкі з хлебам і нападалі на харчовыя крамы. Супроць беспрацоўных дзейнічала паліцыя і пажарныя каманды. Раніцою да будынку гміны падышоў вялікі натоўп голадам зmoраных беспрацоўных жанчын з маленькімі дзяцьмі на руках

— Мы пакідаем дзяцей сваіх у гміне. Рабеце з імі што хочаце. У нас яны ўсёроўна паміраюць з голаду.

Паліцыя разагнала жанчын і шмат каго з іх арыштавала. Гэты факт выклікаў вялікае абурэньне сярод рабочых.

Лодзінскія газэты паведамляюць аб галодным маршы 370 жанчын, якія пехатой ідуць сотні кілёмэтраў з Лодзі ў Львоў. Малюнак гэтага маршу самы жудасны. Катавіцкая газэта „Полёнія“, характарызуючы абстаноўку, піша: „Яшчэ год таму ў краіне спакойна было. Цяпер,—усё больш часта адбываюцца стыхійныя выступленьні, якія могуць прывесьці да жудасных вынікаў. У Явожне рабочыя кінуліся штурмаваць шахты, каб спыніць дзейнасьць помпаў. Паліцыя страляла. У выніку—забітыя і параненыя. У Шэмжыве паліцыя хацела выселіць з кватэры беспрацоўнага рабочага. Рабочыя абаранялі беспрацоўнага і ўступілі ў сапраўдную бойку з паліцыяй. На другі дзень у Вэлюне сэзонныя рабочыя атакавалі паліцыю каменьнямі. Толькі пры дапамозе бомб, якія выклікаюць сьлёзы, удалося навесьці парадак“...

Гэтая самая газэта „Полёнія“ піша: „агульнай рысай усіх выступленьняў апошняга часу—настрой калектыўнага ўзбуджэньня. Паліцыі ўсё цяжэй і цяжэй прыдушаць падобныя эксцэсы. Да аўторытэту ўлады адносяцца з усё з меншай павагай. Настрой адчаю, безнадзейнасьці і абурэньня імкнуцца выкарыстаць комуністы. Тут знаходзяць яны сакавітую глебу. Яшчэ ўвосень інакш было. У масах была яшчэ надзея, што ўрад дапаможа. Сёньня ад усіх гэтых ілюзій нічога не засталося. На моральным разгроме пілсудчыны заробяць комуністы. Забастоўка варшаўскіх трамвайнікаў паказала, што ня гледзячы на складаную сыстэму рэформіцкіх профсаюзаў аказваецца, што ў патрэбны момант яны ніякім аўторытэтам у масах не карыстаюцца“.

Дрэнныя справы польскага фашызму, калі шовіністычная „Полёнія“ вымушана констатаваць факты ў гэтым асьвятленьні і зусім недарма гэтая газэта піша:

„Паўсюды чуваць адно трывожнае пытаньне: Што будзе? Што прынясе нам заўтрашні дзень? Усе гэтак адчуваюць сябе, нібы мы стаімо на краі бяздоньня, глыбіні якой ніхто ня мог-бы зьмерыць... Могуць здарыцца гэткія падзеі, якімі ня змогуць кіраваць людзі, жадаючыя парадку. Можа стварыцца гэткае становішча, якое ўчора лічылася жудасным, але сёньня яно ўжо ня будзе здавацца гэткім страшным, бо горш ужо быць ня можа“.

Гэта словы ня толькі газэты, ня толькі журналіста. Пра гэта афіцыйна заявіў міністар пошты і тэлеграфу Бэрнэр на зьезьдзе паштова-тэлеграфных чыноўнікаў:

„Дрэнна цяпер, але можа яшчэ быць горш“.

Рад дзяржаўных установаў наогул будзе ліквідаваны, у тым ліку тры міністэрствы, між імі міністэрства грамадзкіх работ, якое так ці інакш давала хоць некаторую работу некаторым беспрацоўным. 70 тысяч дзяржаўных чыноўнікаў будуць звольнены, а астатнія будуць атрымліваць жабрацкі заробак.

Для характарыстыкі настрояў шырокіх мас больш-менш людных паселішч Польшчы зьяўляюцца падзеі, якія адбыліся ў Горадні.

Пасьля таго, як у Горадні выбухнула раптам усеагульная забастоўка, яна адразу прыняла гэткія грозныя памеры, што ўраду прышлося ўжыць ваенную сілу. Забастоўка раней пачалася на электрастанцыі і вадаправодзе. Формальнай прычынай для гэтага зьявілася звальненьне без усялякіх прычын двух служачых прадпрыемстваў. Забаставалі: дзяржаўная тытунова фабрыка, пажарнікі, служба шпіталяў, друкарні, служачыя падаткавага аддзелу, млыну, піўнога заводу і служачыя гарадз

кога цэнтру. Пасьля далучыліся і іншыя фабрыкі і прадпрыемствы. З самата пачатку забастоўка прыняла ўсеагульны характар. Па распараджэньні гарадзкой улады электрастанцыя і вадаправод былі заняты тэхнічным войскам. Вакол бастуючых прадпрыемстваў былі выстаўлены ваенныя варты, якія не давалі бастуючым прабрацца на прадпрыемствы.

Адначасова выбухнула стыхійная ўсеагульная забастоўка тэкстыльшчыкаў у Беластоку, з прычыны зьніжэньня на 8 працантаў зарплаты на тэкстыльнай фабрыцы Пагабуцкага. 25 рабочых, якія працавалі на гэтай фабрыцы і не хацелі згадзіцца на гэтае зьніжэньне, былі звольнены. На месца іх былі ўзяты штрэйкбрэхэры, якія працавалі пад аховай паліцыі.

Вестка аб гэтым з надзвычайнай шпаркасьцю пашыралася сярод рабочых. 300 чалавек тэкстыльшчыкаў кінулі працу на фабрыках і зьявіліся перад фабрыкай Пагабуцкага з патрабаваньнем звальненьня штрэйкбрэйхэраў і прыняцьця на працу лёкаўтаваных. Калі фабрыкант адмовіўся гэта зрабіць, была абвешчана ўсеагульная забастоўка на ўсіх тэкстыльных фабрыках Беластоку.

Гродненскія і беластоцкія надзеі выклікаюць вялікую трывогу ў ва ўрадавых колах. У пачатку ліпеня ў Варшаве адбыўся зьезд усіх ваявод Польшчы, на якім адзначалася, што ў радзе буйных гарадоў Польшчы, у часе прыдушэньня выступленьняў беспрацоўных, паліцыя напаткала на гэткія перашкоды, якіх ня ведала гісторыя Польшчы апошніх 12 год.

Выступленьні носяць усё больш бурны і ўпарты характар. На працягу ліпеня ў Вільні адбываліся бурныя дэмонстрацыі беспрацоўных перад магістратам, прычым беспрацоўныя ўрываліся ў будынак магістрату, зьнішчаючы там абстаноўку. 6-га ліпеня група беспрацоўных каля 500 чалавек накіравалася на вуліцы Вялікай і Замкавай да ваяводзтва. Тут дэмонстрацыя вылучыла дэлегацыю ў 5 чалавек, між імі дзьве жанчыны з малымі дзецьмі на руках, якія накіраваліся да ваяводы. Ня гледзячы на распачлівае становішча галадаючых беспрацоўных— ваявода адмовіўся прадставіць ім працу або дапамогу.

Калі адказ ваяводы стаў вядомы дэманстрантам—у вокны ваяводства паляцеў град кяменьняў. Быў выкліканы атрад коннай поліцыі, які дэмонстранты таксама сустрэлі градам каменьняў. Некалькі паліцэйскіх і 16 коняй былі параненым. Толькі пасьля некалькіх атак поліцыі з голымі шаблямі ўдалося ачысьціць вуліцу.

Ня менш бурная дэмонстрацыя 400 беспрацоўных і сялян адбылася ў апошнія дні чэрвеня ў Менску-Мазевецкім. Дэмонстранты накіраваліся да комісарыяту поліцыі, патрабуючы вызваленьня арыштаваных папярэдняга дня дэлегатаў комітэту беспрацоўных. Поліцыя атакавала натоўп. Беспрацоўныя пачалі вырываць дошкі з парканаў і кінуліся на поліцыю воклічамі: „Страляйце ў нас, бо мы ня маем чым карміць галодных дзяцей“. У часе разгону дэмонстрацыі поліцыя арыштавала некалькі чалавек, у тым ліку адну жанчыну. Беспрацоўныя прабавалі адбіць арыштаваных, але бяз посьпеху.

У часе допыту жанчыны комісар поліцыі крычаў на яе: „Ты бальшавічка, комуністка, скажы зараз-жа, хто табе загадаў ісьці на дэмонстрацыю?“ Беспрацоўная адказала: Калі пан хоча, дык магу прывесьці тых, якія мяне выслалі на дэмонстрацыю“.

Абрадаваны комісар, думаючы, што ён ужо выкрыў правадыроў дэмонстрацыі, хутка паслаў жанчыну з поліцэйскімі. Як-жа ён быў раззлаваны, калі праз некаторы час поліцэйскі вярнуўся разам з гэтай жанчынай і 4-мя малымі дзяцьмі.

— Вось тыя бальшавікі, якія мяне паслалі на вуліцу на дэмонстрацыю.

Фашыцкі дыктатар Пілсудзкі адмовіўся рабіць больш цуды і высунуў на першае месца поліцыю і жандармэрыю, каб яны ня цудамі, а кулямі і шаблямі прымусілі сотні тысяч беспрацоўных ціха паміраць з голаду.

І хто ведае, мо' ў гэтай віхуры пролетарыят Польшчы зробіць „цуд“, але ўжо гэты цуд будзе ня цуд, а ўсеагульная забастоўка, якая перарасьце ва ўзброенае паўстаньне, якое зьмяце з твару польскае зямлі капіталістычную анархію разам з яе фашыцкай дыктатурай і соцыял-фашыцкімі падгалоскамі.

„ЮНЫЯ ВЫНАХОДЦЫ“ ДА ЗЬЛЁТУ ПІОНЭРАЎ.





КАНЕЦ ШУ

НАРЫС
Л. БАРЫСАЎСКАГА.

У кітайцаў ёсьць слова „шу“. Гэта значыць павага. Павага не да каго-небудзь, не за што-небудзь, а павага да ўсяго і за ўсё. Павага да гэтага трыпутніка, за тое, што ён расьце, павага да дрэва, да балота і г. д.

Тысячагодзьдзямі іспавала гэта слова ў кітайскім лексыконе, тысячагодзьдзямі выхоўваліся працоўныя масы Кітаю ў павазе да гаспадара, да панскага кія, бізуна, а пасьля да стэка белага гаспадара.

— Шу.—І ў гэтае слова ўкладваўся глыбокі соцыяльны сэнс, клясавы зьмест. Ён навучаў да павагі, да ўсіх зьдзекаў, ад якіх пакутваў працоўны люд.

Чатыраста мільёнаў чалавек разам з малаком маткі ўсмакталі слова—шу. І раптам, узварушыўся, шматсотмільённы кітайскі народ, загулі чмелем горы і цясьніны, і кітайскія рабочыя і сяляне, узяўшы ў рукі сякеры, сярпы, стрэльбы, пашлі на барацьбу з „шу“, на змаганьне з тымі, перад кімі яны з павагай схілялі галовы, згіналі сьпіны, падстаўлялі плечы пад бізун, пад стэк, пад кій.

Шу і шыбельніца маюць аднолькавыя пачаткі слоў і нездарма. Да гонару гэтае краіны—трэба сказаць, што яна перавысіла ўсе іншыя краіны па ўжываньні гэтае машыны. І справа бязумоўна ня ў тым, што ў Кітаі зазвычай ня вешаюць вяроўкай за галаву, а сякачом яе адсякаюць. Адсякаюць галовы рабочых. адсякаюць галовы сялян Спраўна дзейнічае гэта машына.

200 мільёнаў чалавек галадаюць цяпер у Кітаі. Ня можна апісаць жахаў, якія пануюць у кітайскай вёсцы.

Вы знойдзеце галодных у зруйнаванай доўгімі войнамі і абрабаванай рознымі генэраламі кітайскай вёсцы.

Вы іх спаткаеце на „востравах эўропэйскай цывілізацыі“—у імпэрыялістычных сэтльмэнтах, як яны ля драцяной загарожы вымальваюць аб'едкі і рэшткі са сталоў „славутых“ падарожнікаў.

— Ведаеце, містэр Фліт,—кажа беласьнежная лэдзі—150 кілёмэтраў мы пакрылі ў якіх-небудзь паўтары гадзіны.

— Спадзяюся, што вам езьдзілася добра, і што засталіся задаволенымі ад гэтай прагулкі?

— О, не. Мы багата перажылі. Вы ня можаце ўявіць сабе, чаго мы ня бачылі. За нашым аўтомобілем гналіся вялізарныя натоўпы брудных, запэцканых кітайцаў, якія нагадваюць сабой першабытных дзікуноў. Яны аб нечым крычалі. Шофэр казаў, што яны просяць хлеба.

Гэта пакуль што і не паўсюды. У некаторых мясцовасьцях ужо ня так. Але ў буйнейшых цэнтрах, там дзе ўрад Чан-Кай-Ши адчувае сябе больш-менш трывала, там тысячы беспрацоўных галодных працягваюць рукі просячы дапамогі, але містэр Фліт і беласьнежная лэдзі ведаюць, што заўтра гэтыя рукі мільёнаў будуць рваць і нішчыць. Голад ахапіў ня толькі поўдзень і поўнач,— ён пануе ўжо і на захадзе і на ўсходзе Кітаю. Няма ў Кітаі аніводнага гораду або вёскі, дзе ня было-б голаду. І толькі ў савецкіх раёнах, якія знаходзяцца пад аховай корпусаў Чырвонай арміі, голаду няма.

Калі насельніцтва провінцыі Гуань-су есьць гліну, таму што ўсе корані і расьліны даўно ўжо зьедзены галадаючымі, дык гэта зусім ня значыць, што быў дрэнны ўраджай. Гэта толькі яшчэ раз сьцьвярджае, што тут пануе генэральскі ўціск.

Мак сеяць ня можна, бо з яго атрымліваецца опіум, а ён, ведаеце, дрэнна адбіваецца на здароўі народу. А генэралы, якія гэты закон пісалі, прымушаюць сялян засяваць... мак. І калі бядняк, абадраны падаткамі, уздумае адмовіцца ад засяваньня маку, дык яго абкладаюць вялікім падаткам.

І гэтак паўсюды—на поўдні, на поўначы, на захадзе і ўсходзе, паўсюды голад, генэралы і опіум.

На адным кітайскім канцавосьсі ідзе ўзмоцненае будаўніцтва, зьнішчэньне ўсяго контррэволюцыйнага панаваньня, замацаваньне рэволюцыйных заваёў, а на другім згуртавана ўсё фэўдальна-мілітарыстычнае, буржуазна-памешчыцкае і сярэднявечнае невуцтва. На гэтым канцавосьсі ў шчыльным клясавым сутаварыстве жывуць кітайскія генэралы, буржуазія, памешчыкі і чужаземныя імпэрыялісты.

Вось сюды, на гэтае канцавосьсе сутаварыства міжнароднага бандытызму вядуць тыя карані, якія нарадзілі гэты жудасны голад, які ў працягу некалькіх год душыць сотні мільёнаў кітайскіх працоўных. Голад ва ўмовах кітайскай генэральскай і мілітарыстычнай сапраўднасьці мае не пераходны, а сталы характар.

Чаму няма голаду ў савецкіх кітайскіх раёнах? Калі ў генэральскіх раёнах сыстэма кіраўніцтва зьяўляецца сыстэмай гвалту і рабунку, сыстэмай зьдзекаў і катаваньняў, а ў справе кіраўніцтва зьяўляецца зусім бяссыстэмнай, пабудаванай на асабістым уціску таго або іншага генэрала або памешчыка, дык у савецкіх раёнах сыстэма кіраўніцтва грунтуецца на колектывах працоўных. Тут сыстэма кіраўніцтва прадыктавана непасрэдна вялізарнымі масамі працоўнага насельніцтва. У сэнсе ліквідацыі голаду савецкая сыстэма кіраўніцтва ў першую чаргу ажыцьцявіла організацыю складаў харчаваньня, зьнішчыла гандлёвую спэкуляцыю, нормавала цэны, забараніла сяўбу маку, замяніўшы яго збожжавымі культурамі. Канчаткова вызваліўшы сялян ад падаткаў, кіраўніцтва савецкіх раёнаў упяршыню ў гісторыі кітайскага сялянства дала яму мажлівасьць вольна і спакойна валодаць зямлёй і займацца сваёй працай.

І вось чаму на адным канцавосьсі Кітаю нараджаецца клясавае, сьвядомае разуменьне, новае ўяўленьне шу—павагі да савецкай сыстэмы кіраўніцтва, бо гэтая сыстэма, гэта—яны, шматмільённыя масы Кітаю.

У розных раёнах Кітаю стварыліся Чырвоныя арміі, якія зрабілі пачатак для далейшага пашырэньня савецкіх раёнаў.

Усе тры савецкія раёны пакуль што перарваны невялікімі палосамі тэрыторыі, занятай белым войскам.

Памешчыкі і буржуазія ня спыняюць свае спробы вярнуць сабе назад страчаныя раёны. Атрады памешчыцкіх дружын, схаваных у горных цясьнінах, робяць частыя набегі на савецкую тэрыторыю. Калі набегі канчаюцца перамогай белых, яны адбіраюць быдла, забіваюць мужчын, а жанчын і дзяўчат прадаюць у няволю. Ня можна зьмешваць памешчыцкія атрады з нанкінскім войскам, якое ў сваю чаргу вядзе самастойныя ваенныя опэрацыі супроць Чырвонай арміі, ужываючы ўсе дасягненьні вайсковай тэхнікі.

Насельніцтва савецкіх раёнаў вядзе героічнае змаганьне супроць рэакцыі.

Мужчыны і жанчыны, маладыя і старыя амаль усе знаходзяцца ў пастаяннай баявой гатоўнасьці. Атрады Чырвонай арміі знаходзяць гарачае падтрыманьне сялян, якія выведваюць у праціўніка ўсё патрэбнае Чырвонаму войску, перарэзваюць тэлефонныя правады ў раёнах белага войска і г. д.

У савецкіх раёнах вядзецца багатая праца па гаспадарчым будаўніцтве, а таксама па ўзьняцьці культурнага ўзроўню насельніцтва. Зямля разьмеркавана гэтак, што ёю карыстаецца сапраўды працоўнае сялянства. Сяляне з вялікай ахвотай перадаюць Чырвонай арміі рэшткі свайго хлеба. Пазычаны ў сялян хлеб варочаецца ім назад.

З дзяржаўных фондаў частка хлеба вылучаецца для бяднейшага сялянства. Улады на мясцох забясьпечваюць бяднейшае сялянства земляробчымі машынамі. Створаны спэцыяльны комітэт дапамогі сялянскай беднаце.

Савецкі ўрад рашуча змагаецца са спэкуляцыяй і хабарніцтвам. Гандляры абкладаюцца прогрэсыўным падаткам.

Амаль ва ўсіх савецкіх раёнах створаны мясцовыя газэты. Выдаецца таксама тэорэтычна-марксысцкі часопіс „Ленінскі штотыднёвік“. Выходзіць орган комуністычнай партыі „Партыйнае жыцьцё“, масавая газэта „Савецкая ўлада“ і два чырвонаармейскіх органы „Чырвоны ваяка“ і „Жыцьцё чырвонаармейца“. Амаль ва ўсіх вёсках выдаюцца свае мясцовыя газэты і невялікія ілюстраваныя часопісы. Паўсюды створаны ленінскія школы для юнацтва і для дарослых. У кожным раёне існуе вышэйшая ваенна-палітычная школа для партыйных працаўнікоў і камандчага складу.

Усе гэтыя мерапрыемствы савецкае ўлады стварылі гэткія ўмовы, што савецкія раёны зьяўляюцца амаль сапраўднымі цытадэлямі. Першая і другая экспэдыцыя нанкінскага войска ня

толькі не разьбілі чырвоных, але ў значнай меры ўзмацнілі іх. Нават буржуазны друк вымушаны адзначыць, што ў выніку толькі аднаго месяцу барацьбы, узімку мінулага году, чырвоныя арміі атрымалі дзесяткі тысяч вінтовак, масу кулямётаў і гармат. Буржуазныя наглядальнікі, якія прыяжджаюць з франтоў, адзначаюць, што толькі адзін месяц боек павялічыў сілу чырвоных армій на 50 проц. Гэта гісторыя паўтарыцца зноў.

Чужаземныя корэспондэнты мяркуюць, што Чан-Кай-Шы ня зусім сур'ёзна змагаецца з чырвонымі, бо ён баіцца застацца без ваенных сіл у выніку некалькіх зусім магчымых паражэньняў.

Звычайная гутарка чужаземцаў: „Цяпер Кітай на верным шляху да саветызацыі", „Саветызацыя—цяпер толькі пытаньне ў часе". І гэтыя меркаваньні чужаземцаў спраўдзіліся ў даволі значнай меры ў самы бліжэйшы час.

Корэспондэнт газэты „Чайна-Прэс", якая выходзіць на ангельска-кітайскай мове, піша наступнае: чырвонае войска раптам павярнула ў бок Фуцзянскай мяжы з гораду Наньфіна, разьбіла дывізію генэрала і захапіла ў палон два палкі. 19 армія адступае. Пятая армія амаль зусім разьбіта чырвоным войскам. Чырвоныя прарвалі лінію 19 арміі і разьбілі дзьве дывізіі рэштак пятай арміі і захапілі дзесяць тысяч вінтовак, шмат кулямётаў, некалькі цяжкіх гармат і вялізарныя запасы провіянту.

Разглядаючы падзеі, якія пайшлі, па думцы корэспондэнта на карысьць чырвоных армій, ён піша: „разьбітая чырвоным войскам пятая армія складалася з чатырох дывізій і толькі прыбыла ў Цзянсі з Хубоя для падмацаваньня. Нанкінскага войска ў провінцыі было каля 180 тысяч. Яно наступова адціснула чырвоных, пакуль апошнія засталіся толькі на тэрыторыі пяці паветаў і генэрал Гу-бін-фан заняў горад Дуагу. Тады чырвоныя перайшлі ў контрнаступленьне. Сяляне, узброеныя пiламі, нажамі, вінтоўкамі і кулямётамі, зрабілі значнае апусташэньне сярод нанкінскага войска. Адбылася жорсткая бойка і нанкінскае войска прымушчана было адступаць. Усе дывізіі страцілі амаль усю сваю зброю, забітых і параненых налічваліся тысячы і сам генэрал Гу-бін-фан забіты. Войска Чшу-Дэ мела свой штаб-кватэру на ўсход ад Дунгу. У 30-кілёмэтрах ад гэтага пункту знаходзілася 19 урадавая армія. Аднак, усе спробы гэтай арміі злучыцца з астатнімі нанкінскімі дывізіямі пацярпелі няўдачу.

Пасьля паражэньня пятай арміі быў аддадзены загад 19 арміі адступіць для выраўненьня лініі. Тады чырвонае войска перайшло ў наступленьне і адціснула 19-ю армію.

Такім чынам, комуністы падвоілі сваю тэрыторыю і ў многа разоў павялічылі сваю „баявую здольнасьць". Такім чынам—у агні барацьбы, у жудасным тэроры з боку контррэволюцыйнага Гоміндану нараджаецца кітайская рэволюцыя.

Вестка аб пакараньні тав. Сян-Чу-Фа, гэнеральнага сакратара кітайскай кампартыі, выклікала крык болю і протэсту ў асноўных цэнтрах кітайскага рабочага руху, бо Сян Чу-Фа быў адным з лепшых сыноў кітайскага пролетарыяту. Ён пачаў сваю работу ў якасьці работніка арсэналу. Пазьней працаваў на самым буйным заводзе Кітаю. Сын селяніна, як і ўсе кітайскія рабочыя, ён з дзіцячых год пазнаў бязьмерную бядоту і эксплёатацыю. Але там, на вялікіх заводах, створаных кітайскай буржуазіяй, тав. Сян-Чу-Фа апрача бядоты, пазнаў і тую вялікую сілу, якая нараджаецца ў індустрыяльных цэнтрах, якая выгартоўваецца на сучасных заводах Кітаю. Ён убачыў сябе сынам ня толькі аднэй з соценьтысяч вёсак Кітаю, але і сынам новай клясы, якая нараджаецца і заклікае зьмяніць твар старога Кітаю.

Да яго даходзілі весткі аб імпэрыялістычнай вайне, якая заліла крывёю ўвесь сьвет і сказала пролетарыяту: „або загіне чалавецтва, або капіталізм". І тав. Сян-Чу-Фа перамог усе хістаньні, ён зрабіўся організатарам масавага протэсту, масавага забастовачнага руху, ён організаваў у 1923 г. першую ўсеагульную забастоўку ў галоўным індустрыяльным цэнтры Кітаю.




Сян Чу-Фа гэн. сакр. ЦК кітайскай кампартыі пакараны сьмерцю нанкінскімі катамі.

Сусьветная буржуазія ўрачыста даніявала канец кітайскай рэволюцыі і стабілізацыю капіталізму, гэта было пасьля здрады Чан-Кай-Шы, калі контррэволюцыйны Гоміндан здрадзіў маладой рэволюцыі. Тав. Сян-Чу-Фа, які зрабіўся ўжо цьвёрдым бальшавіком-ленінцам, ведаў тады, што дарма радуюцца капіталісты. Ён ведаў, што Чан-Кай-Шы ня даў нічога сялянству, ня даў нічога пролетарыяту, што становішча працоўных мас яшчэ больш пагоршылася. Але тав. Сян-Чу-Фа ня быў гледачом, які стаіць і чакае пакуль гісторыя прынясе свае плады. Ён узяўся рыхтаваць гэтую буру. У якасьці генэральнага сакратара кітайскай компартыі, тав. Сян-Чу-Фа прадстаўляў той асноўны кадр кітайскіх рэволюцыйных рабочых, які перамог да канца ўсе правыя і левыя ўхілы і хістаньні інтэлігенцыі і здолеў закласьці сапраўдныя асновы комуністычнай бальшавіцкай партыі Кітаю і гэтая партыя прывядзе да канчатковай перамогі працоўных кітайскіх мас над сусьветнай і кітайскай буржуазіяй.

Няхай цешацца шанхайскія каты, што Сян-Чу-Фа больш няма. Як молат выгартоўвае сталь, гэтак выгартоўвае люты тэрор Чан-Кай-Шы жалезную катаргу кітайскіх пролетарскіх барацьбітоў, якія здымуць галовы з плеч кітайскай буржуазіі, вырвуць уладу з брудных рук кітайскай ваеншчыны і ўзьнімуць над Кітаем сьцяг перамогі, сьцяг пролетарскай рэволюцыі.

Канец шу азначае—канец старога Кітаю, нараджэньне новае краіны з новымі людзьмі, якія неўзабаве ўвальюцца магутным атрадам у адзіны сусьветны Саюз Савецкіх Соцыялістычных Рэспублік.





Галовы пакараных у Кантоне партызан, якія выстаўлены для ўстрашэньня на вуліцах гораду.

НА СТАРТ ПЕРАМОГІ.

Чорны вэлюм спусьціла сутоньне
На палотны бялюткіх хатак.
Лягер сьпіць, як заўсёды, і сёньня
Пасьля дзённых, упартых занятак.

Па пяску-ж ціха шоркаюць боты,
Узад і ўперад шнуруе днявальны.
Вецер зьмешаны з конскім потам
Мчыцца грозна ў лёце дальнім.

Но, што ластаўка, пырсьне аблiччам,
У прочкі пойдзе дрымотная зданьню.
На заняткі гарністы кліча
Сьвежым ліпеньскім, яркім раньнем.

— Па конях..
Направа...
Марш...

Чуюцца словы—каманды разьбег.
Першы прыз павінен быць наш,
Верш павінны мы ўзяць у „барацьбе".

Мы спаборніцтвам працу разорнем.
Выдзем сьмела на старт перамогі.
Грозны подых вайны ў разгоне,
Дні на беразе новай трывогі,

Вось чаму наша праца імкненьні
Быць павінны ў напружаным стане.
Хоць цяпер нашы коні і ў пене—
Перамога за намі ў змаганьні.

Марк Процька

ДВА СЛОВЫ пра ДЗЯРЖЫНСКАГА

АРТЫКУЛ МЯНЖЫНСКАГА



Ф. ЭД. ДЗЯРЖЫНСКІ.

Пяць год, як няма Дзяржынскага.

Але жыве яго справа, жывуць яго думкі, жыве яго тактыка, і з ім прыходзіцца лічыцца як з жывым будаўніком соцыялізму, работнікам сучаснасьці, а не героічнай фігурай мінулага, адыходзячай з кожным днём у забытасьць. Дзяржынскі быў практык, не тэорэтык, а ўплыў практыкаў, сышоўшых са сцэны, хутчэй згасае, але ён—сумленны, адданы і сьціплы ў сваёй героічнай велічы партыйны дзеяч, умеў быць дыялектыкам у сваёй рабоце, навучыўся дыялектыцы ў рэволюцыйнай барацьбе, на катарзе і высылцы, у партыйным супрацоўніцтве з Леніным і Сталіным—і ён жыве, ён дагэтуль апладатварае справу барацьбы за комунізм.

Дзяржынскі літаральна да канца быў верны партыйным заветам, аддаў сваё жыцьцё за іх для рабочай клясы, для партыі, проста, ня выпукляючы сваёй фігуры. А тыя, з якімі пад кіраўніцтвам Сталіна ён змагаўся, опозыцыянэры,—калі яны ўпарствуюць,—яны знаходзяцца па той бок барыкады, лаюць пяцігодку на старонках буржуазных газэт, капаюць маленькую ямку пад будуючымся соцыялізмам побач з Гувэрам і іншымі імпэрыялістамі.

Прыклад: жывы мярцьвяк у Константынопалі, літаратар-рэнэгат.

Словы Сталіна аб старой тэхнічнай інтэлігенцыі і аб нашым падыходзе да яе—ці-ж не гавораць яны аб жывучасьці тактыкі Дзяржынскага, ня выдуманай ім, а цалкам выцякаўшай з партыйных вытокаў?

Я не сумняваюся, што Дзяржынскі з усёй палкасьцю сваёй істоты вітаўбы прамову Сталіна на нарадзе гаспадарнікаў, яна была-б для яго роднай і таварышы гаспадарнікі маглі-б гэта давесьці, але я хачу расказаць толькі аб тым, як у нашых абставінах у абставінах нэпу Дзяржынскі праводзіў адпаведную лінію ў адносінах да старых спэцыялістаў і ў НКШляхоў і ў ВСНГ і як ён прымушаў АДПУ дапамагаць яму ў яе правядзеньні.

ВСНГ, калі Дзяржынскі пачаў у ім сваю работу, зьяўляўся свайго роду новым каўчэгам, асеўшым на Мілюцінскім завулку: многа старых гаспадарнікаў, вопыт якіх вельмі часта вымяраўся колькасьцю разваленых прадпрыемстваў, часта не хацеўшых вучыцца і ня ведаўшых вытворчасьці. З другога боку—безьліч сп-цаў, займаўшыхся тады шкадлівым клапатлівым нічоганяробленьнем, схэмамі, проектамі, перапіскай, у тым ліку і са сваімі былымі гаспадарамі, якім нават іншыя буйнейшыя імёны рускай тэхнікі ня гнушаліся паведамляць за мзду весткі аб стане іх былых прадпрыемстваў.

Фэлікс Эдмундавіч прыйшоў туды з цяжкім сэрцам. Яшчэ ў НКШляхоў яму было вядома, што многія будучыя правыя опозыцыянэры лічуць яго ўдарнікам, а не гаспадарнікам, чакісцкімі мэтодамі падняўшым транспорт ад разрухі. Тыя-ж асобы не бяз зларадзтва чакалі, ці не праваліцца ён, ці вытрымае экзамен на гаспадарніка, кіруючы гэткай махінай як ВСНГ.

Час быў нэпаўскі і цяжкі: яго прыходу папераджаў цяжкі крызіс цэн.

На дапамогу гэтых „прыяцеляў“ Дзяржынскі не разьлічваў, але ў яго былі энкапээсаўскі вопыт і чакісцкія мэтоды, аснова якіх зводзілася да таго, каб ні накогане спадзявацца ўсё правяраць на фактах, даходзіць да іх самому, працаваць з максымальнымі тэмпамі, разьвіваючы шалёную энэргію, абапірацца на рабочую клясу і безагаворачна слухацца партыі. Быў у яго вопыт і са старымі спэцамі, таму што ў 1921—24 гадох маладых спэцыялістаў ня было. Прыйшоўшы ў НКШляхоў, Дзяржынскі адразу ўзяў тую лінію на прыцягненьне спэцыялістаў да работы, прадстаўленьне яму максымальнай самастойнасьці і патрабаваньне ад яго сапраўднай работы, а не прожэктарства, якую ён вёў да самай сьмерці. Дырэктыўны загад па НКШляхоў на 27 мая 1921 г. гаворыць: „да тых з тэхнічных кіраўнікоў, якія натхнёны вялізарнасьцю стаячых перад імі задач па тэхнічным адраджэньні транспорту рабоча-сялянскай рэспублікі і працуюць самааддана і сумленна, мы абавязаны аднесьціся з поўным давер'ем і таварыскай увагай“. Гэта Дзяржынскі і праводзіў.

Дзяржынскі шырока скарыстаў АДПУ для абароны спэцыялістаў ад рознага роду ўціску, жыльлёвага і іншых, але ён вельмі хваравіта адносіўся да фактаў апошняга роду, яны зрывалі яго лінію, ён лічыў, што калі соцыялістычнае будаўніцтва сваёй магутнасьцю прыцягвае да нас нават былых актыўных контррэволюцыянэраў, іх трэба скарыстаць абавязкова—ва ўсю, і да тых пор, пакуль яны ідуць з намі. Трымаць адчыненымі вочы трэба, але нельга дапускаць, каб людзі, працуючыя з намі пад уплывам прасьледваньня абкружаючага асяродзьдзя і яго вечнай сападазронасьці і недавер'я, часта няпісьменнага, зноў адыходзілі ў лягер ворагаў.

У НКШляхоў Дзяржынскаму ўдалося вывесьці транспорт з разрухі, аб'яднаўшы вакол сябе ў адным героічных парыве і чыгуначны пролетарыят, і комуністаў, і спэцыялістаў, а калі ўласных сіл транспорту не хапала, ён налягаў на транспортны аддзел АДПУ, дзе было многа чыгуначнікаў, і ў цяжкіх выпадках падмяняў іх сіламі прышоўшую ў расстройства рэгулярную работу транспорту. Транспортнікі АДПУ працавалі дзень і ноч, то прасоўваючы грузы, то ахоўваючы іх, то змагаючыся з бандытызмам, кражамі ашуканствам і інш. і інш., гадамі ня маючы адпачынку, як на фронце.


У апошні год яго работы на транспорце здарыўся такі маляўнічы выпадак: яму патрабавалася адна важная табліца; атрымаўшы яе, Дзяржынскі са зьдзіўленьнем убачыў, што малюнак атрымліваецца надзвычайна незразумелы. Пайшоўшы ў водпуск на 10 дзён, Дзяржынскі засеў за гэтую табліцу, і ён, Наркомшляхоў, павінен быў сам пералічыць і перарабіць яе і тады з абурэньнем пераканаўся, што ня толькі даныя пераблытаны, але нават складаньне нявернае. Для добрадушнага агульнага давер'я да апарату месца ня было.

З гэтым вопытам Дзяржынскі прыступіў да ВСНГ, і ўсё-ж такі лініі сваёй да спэцыялістаў ён не зьмяніў. Гэта ў першую чаргу адчувала АДПУ. Калі мы атакоўвалі яго па поваdзе якіх-небудзь меншавікоў, ён нязьменна паўтараў нам: „Зараз яны бясьсільны, да пары да часу пакіньце іх у спакоі, няхай яны працуюць, я суджу аб іх па рабоце“. Ня буду падаваць далейшых прыкладаў, як ён політычна выхоўваў работнікаў АДПУ, ня буду паўтараць усім вядомых публічных выступленьняў Дзяржынскага аб старых спэцыялістах, ня мне апавядаць, як ён чысьціў, рэорганізаваў ВСНГ. Пытаньне так і было пастаўлена, што можна будзе ўзяць у нас для ўздыму прамысловасьці, па-першае, людзей, людзей і людзей. Будучы Наркомшляхоў, Дзяржынскі абапіраўся на транспортны аддзел АДПУ, прамысловай ЧК ня было, а ствараць яе ён лічыў бескарысным. Сярод транспортнікаў было многа чыгуначнікаў, але прамысловай тэхнікі мы тады ня ведалі. Вопыт ВЧК па барацьбе са спэкуляцыяй і справы па безгаспадарчасьці складалі дрэнную падрыхтоўку для такой прамысловасьці ЧК, якая магла-б быць карысна Дзяржынскаму, але буйных талковых людзей з інтарэсам да экономікі, жадаючых вучыцца вытворчасьці—было многа. Дзяржынскі іх і зрабіў праваднікамі сваёй лініі ў адносінах да спэцыялістаў, забраўшы іх усіх у ВСНГ.

Як мы тады гаварылі, ВСНГ ператварыўся ў грабілаўку, забірае нашых людзей. Мы разумелі неабходнасьць гэтай меры і вынікі работы Дзяржынскага ў ВСНГ зусім яе апраўдалі. Але нарэшце, і мы ня страцілі. Калі зьмяніліся абставіны і запахла інтэрвэнцыяй і цэлы рад інжынэраў заняўся шкодніцтвам, дык выкрылі гэтых шкоднікаў на капальнях і НКШЗ два таварышы, узятыя Дзяржынскім на работу ў ВСНГ і якія вярнуліся цяпер да нас. Карыстаючыся сваім вопытам, яны змаглі паставіць колумбава яйка, што зьяўляецца асноўным у барацьбе з новымі формамі контррэволюцыі. Школа Дзяржынскага не прапала дарма.

ЦЫНГІЛЬБУД

РАБОЧЫ ТЭАТР ПРЫ ЦСПСБ



МАСТАК АХРЭМЧЫК



ПАСТАНОУКА РЭЖЫСЭРА ГАЛАУЧЫНЕРА

ЗДЫМКІ САЛАВЕЙЧЫКА

КНІЖНАЯ ВІТРЫНА

Платон Галавач.—„Доляры“ (аповесьць) БДВ, Менск, 1931 г. 80 стар. цана 30 кап.

Платон Галавач—сёньня зьяўляецца адным з буйнейшых нашых пролетарскіх пісьменьнікаў. Яго творчасьць зьяўляецца найлепшым доказам няўхільнага росту нашай пролетарскай літаратуры.

Проблема асобы і колектыву распрацоўваецца ў шэрагу яго твораў, як „Вінаватыя“ і „Доляры“.

У аповесьці „Доляры“ Галавач паказвае ўплыў дробнабуржуазнага асяродзьдзя на паасобных сяброў рабочага колектыву і членаў партыі. Работніца дражджавога заводу комуністка Зося Хмарына атрымала ў спадчыну з Амэрыкі дванаццаць тысяч доляраў, але гэты факт захаваўла ад ячэйкі. Адначасна яна трапляе пад уплыў дробна-буржуазнага асяродзьдзя і калі перад ёй паўстае пытаньне аб перадачы грошай у агульнапартыйную касу, яна адмаўляецца. Алпачасна



аўтар выводзіць цэлую галерэю адданых справе рабочых, якія змагаюцца за палепшаньне якасьці продукцыі.

Гэта проблематычнасьць яго творчасьці пашырае і абагачае нашу пролетарскую літаратуру.

Аўтар ставячы рубам пытаньне, прымушае чытача задумацца, аформіць свае адносіны да такіх фактаў.

Міхась Зарэцкі.—„Лісты ад знаёмага“. БДВ, Менск, 1931 г., стар. 144, цана 55 кап.

Новая кніжка М. Зарэцкага зьмяшчае два творы: „Лісты ад знаёмага“ і „Вясна 1930 г. „Іх тэматыка—вялізарныя зрухі, якія адбываюцца ў жыцьці вёскі. „Гэтыя нарысы паказваюць чытачу, як у сьвядомасьці пэўнай групы пісьменьнікаў пераламляецца рэальны поступ социялізму.Ператварэньне дробна-таварнага паўпатрыярхальнага селяніна ў сьвядомага актыўнага працаўніка социялістычнай гаспадаркі“. Аднак аўтар ня здолеў адчуць усю складанасьць і глыбіню гэтых процэсаў, даць іх у органічнай сувязі з падзеямі вялізнай гістарычнай важнасьці і клясавай практыкай. Зарэцкі ў гэтай кнізе ўяўляецца ў постаці староньняга назіральніка, а не актыўна-дзейнага ўдзельніка нашага социялістычнага буд`ўніцтва.

Аднак, усё-ж кніжка сьведчыць, што „Зарэцкі нерашуча, непасьлядоўна, з аглядкаю назад, хістаючыся з боку ў



бок, кульгаючы, робіць дзяціныя крокі на шлях савецкага пісьменьніка, нясучы пры гэтым і на сабе, і ўнутры сябе свой ранейшы дробна-буржуазны груз“.

Будзем спадзявацца, што наша рэчаіснасьць „дасьць запал і матэрыял для далейшай творчасьці Зарэцкага і яго суб'ектыўныя імкненьні, што вылучаюцца ў гэтай кніжцы, набудуць об'ектыўную рэальнасьць“. Да кніжкі прадпаслана прадмова Л. Бэндэ.

С. Знаёмы. „Дом № 31“ (нарысы), 56 стар., цана 22 кап.

С. Знаёмы.—„За дамбаю“ (нарысы) 120 стар., Цана 40 кап., БДВ, Менск, 1931 г.

У свой час мы аднатоўвалі выхад другой кніжачкі „Відагоршчы“ („Чырвон. Белар.“ № 9—1930) былога ра-



бочага „Чырвонай Бярэзіны“ С. Знаёмага. Дзьве ягоных новых кніжкі зьмяшчаюць шэраг нарысаў з жыцьця рабочых на фабрыках і заводах Беларусі. Частка нарысаў друкавалася ў газэтах, другая частка зьяўляецца ў друку ўпяршыню. Фабрыка „Чырвоная Бярэзіна“, шчотачная імя Крупскай, „Беларуска“, завод „Комунар“, Гомсельмаш, рабочы пасёлак, праца плытагонаў—вось аб чым піша аўтар. Социялістычнае спаборніцтва, ударніцтва, барацьба за выкананьне промфінпляну—вось што стаіць у асяродку яго ўвагі. І трэба сказаць, што з сваімі тэмамі аўтар, у асноўным, справіўся. Ён здолеў паказаць сапраўды жывых людзей нашага сёньня, якія выконваючы сваю, іначы няязначную, працу змагаюцца за социялізм. Лепш у параўнаньні з ранейшай кніжкай, аўтар аўладаў мастацкімі сродкамі. Будзем спадзявацца, што ў сваіх наступных творах аўтар, не адрываючыся ад асноўных крыніц сваёй творчасьці, здолее паказаць рост і аформленьне новага чалавека. Часткова гэта мы ўжо маем у „Каці Астаповіч“ (зб. „За дамбай“).

С. Малашэнка і А. Лейбман,—„Новы цэх варашылаўцаў“. БДВ, Менск, 1931 г., 28 стар., цана 7 кап.

Заклік рабочых ударнікаў у літаратуру, які пачаты Бел. АПП, пачынае даваць пэўныя конкрэтныя вынікі.

Гэта невялічкая кніжачка зьяўляецца першай ластаўкай творчасьці рабочых-ударнікаў на Беларусі, якая выходзіць асобным выданьнем. Напісаная двума рабочымі заводу імя Варашылава яна паказвае змаганьне рабочых



за новы цэх на сваім заводзе, за цэх грамадзкага харчаваньня.

Рэорганізацыя мэтодаў грамадзкага харчаваньня на заводзе, якая праводзіцца пад лёзунгам „Сталоўка—цэх прадпрыемства“, барацьба заводзкіх організацый за лепшую пастаноўку грамадзкага харчаваньня—вось што стаіць у асяродку ўвагі аўтараў. Яны не ізолююць пытаньне грамадзкага харчаваньня. Для іх новая сталоўка „новы цэх варашылаўцаў“—дапаможнік у барацьбе за выкананьне і перавыкананьне промфінпляну. Аўтары паказваюць, як дзякуючы неорганізаванасьці харчаваньня на заводзе штодзенна марна губляліся звыш 100 працоўных гадзін і як рэорганізацыя дапамагла зьнішчыць гэта ненормальнае зьявішча. Будзем спадзявацца, што ўсьлед за гэтай першай кніжкай зьявяцца дзесяткі новых кніжок рабочых-ударнікаў. Трэба толькі пажадаць, каб гэта кніжка як мага хутчэй і шырэй была пашырана.


Выданьне Беларускага Дзярж. Выдавецтва — Адказны рэдактар МІХАСЬ ЧАРОТ.

ШАХМАТЫ № 4

Пад рэдакцыяй А. А. КАСЬПЕРСКАГА і Я. Е. КАМЯНЕЦКАГА.

Міжнародны конкурс складаньня шахматных задач „Чырвонай Беларусі“

Задача № 7. Дэвіз „Колектыўная“




Белыя: Крe1, Фg2, Лc3, Cb5 i f8, Ke6 i g5, пd6... (8)

Чорныя: Крd5, Фh7, Лa6, Cb6, Kb1, пп: a7, b7, c7, e3, e4, e5, g7, h5 (13)

Мат у 2 хады.

Задача № 8. Дэвіз „Перамога“



Белыя: Крa5, Фg8, Лc5 i f7, Cb1 i g1, Kc6 i d4, пп e2, f3, f6... (11)

Чорныя: Крf4, Фh8, Лh5, Cg5, Kf1, пп e3, g2, g3... (8)

Мат у 2 хады.

Усесаюзныя шахматна-шашачныя спаборніцтвы ў 1931 г.

1. Парадак правядзеньня ўсесаюзных спаборніцтваў, асьвечаны ў № 10 „Чырвонай Беларусі“; некалькі зьменен,—акрамя турніраў па рэспубліках і вобласьцях, з правам удзелу пераможцаў у чэмпіянаце; да ўдзелу ў чэмпіянаце будуць дапушчаны чэмпіёны наступных гарадоў: Масквы, Ленінграду, Харкаву, Тыфлісу і Менску, да гэтых турніраў будуць дапушчаны і ня толькі пераможцы з ліку лепшых ігракоў, заняўшых у чэмпіянатах вышэйшыя месцы.

2) Таксама намечана правесьці малы чэмпіянат па шашках у асноўным на тых самых умовах, на якіх праводзіцца і шахматны чэмпіянат.

3) Турнір чэмпіянат па шахматам Чырвонай арміі.

4) Жаночы шахматны турнір чэмпіянат.

5) Командныя шахматна-шашачныя спаборніцтвы на першынства ЎсеЦСПС.

Я. С. ВІЛЬНЭР †

29 чэрвеня ў Ленінградзе памёр шахматны майстар Я. Вільнэр (нарад. у 1899 г.). Пакойны лічыўся адным з лепшых ігракоў УССР, таксама цікавіўся і шахматнай композыцыяй і неаднакраць на конкурсах браў адлічча. У практычнай ігры Я. Вільнэр больш цікавіўся самай партыяй, менш зьвяртаючы ўвагі на месца ў турніры; таму ўсе партыі яго прасякнуты асноўнай ідэяй выйграць—будзь што будзе. У 1925 г. ў Ленінградзе на Ўсесаюзным шахматным чэмпіянаце Я. Вільнэр першы выйграў у тады неперáможнага Е. Багалюбава (партыя ніжэй).

Белыя Е. Багалюбаў, Чорн. Я. Вільнэр.

1. d2—d4, d7—d5; 2. Kg1—f3, Kg8—f6; 3. c2—c4; c7—c6; 4. e2—e3, e7—e6; 5. Kb1—c3, Kb8—d7, 6. Cf1—d3. d5:c4; 7. Cd3:c4, b7—b5; 8. Cc4—b3, a7—a6; 9. e3—e4, c6—c5; 10 e4—e5, c5:d4; 11. Kc3:b5. Так ігралі да гэтай партыі па рэцэпце майстра Блюмэнфэльда, 11...Kd7:e5 лічыцца лепшай абаронай, ход паказан майстрам Созіным. 12. Kf3:e5 ab:b5, 13. o—o, Фd8—d5!; 14. Фd1—f3 Cc8—ab; 15. Cc1—g5, Cf8—c7; 16 Лf1—c1? o—o; 17. Фf3—h3 h7—h6; 18. Cg5—f4, Cc8—b7; 19. Лc1—e1 ладзьдзя вярнулася, але позна; 19... Ce7—e4!, 20. Лe1—e2, Лa8:a2; 21. Лa1—f1, Лf8—a8; 22. f2—f3, Cbe—f8!; 23. Kc5—g4, Kf6:g4; 24. Фh3:g4, Фh5—b3!; 25. Cd3—b1. Лa2:b2; 26. Лe2—e1, d4—d3; 27. Лe1—c1, Лa8—a1; 28, Cb1—c2, Лa1:c1. Багалюбаў здаўся. Партыя праведзена Вільнэрам у найлепшым стылі.

ЦАНА 15 кап.

Друкарня імя Сталіна Зак. № 1652, (8.000 экз.). Галоўлітбел № 1031.